УДК 37.012+808.53

**А. М. Гацко**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# РОЛЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ФАРМІРАВАННІ ПРАФЕСІЙНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ БУДУЧАГА НАСТАЎНІКА

**Уводзіны.** Навукова-тэхнічны прагрэс аказвае ўплыў на ўсе сферы чалавечай дзейнасці. Узрастаюць патрабаванні да якасці працы, да развіцця прафесійных функцый работнікаў, паколькі ў працэсе працоўнай дзейнасці чалавек выступае як вядучая сіла грамадскіх пераўтварэнняў.

Якасці асобы будучага спецыяліста закладваюцца ўжо ў школе, з першых дзён навучання. Першыя маральныя, псіхалагічныя і дзелавыя якасці асобы дзіця атрымоўвае ў дашкольных установах і ў пачатковых класах. Таму да выхавальнікаў дашкольных устаноў і настаўнікаў пачатковых класаў прад'яўляюцца надзвычай высокія прафесійныя патрабаванні.

**Асноўная частка**. Нягледзячы на значныя дасягненні ў падрыхтоўцы педагагічных кадраў, апошнім часам пачалі назапашвацца нявырашаныя праблемы, выяўляюцца пэўныя недахопы. Узровень навучання і выхавання будучых педагогаў не заўсёды ў поўнай меры адпавядае пастаўленым задачам; у вучэбна-выхаваўчым працэсе дагэтуль пашыраны экстэнсіўныя формы і метады выкладання, ухіл робіцца на пашырэнне аб'ёму матэрыялу ва ўрон развіццю навыкаў самастойнага, творчага мыслення, педагагічнага майстэрства.

Адной з прычын указаных недахопаў з'яўляецца паступленне ва ўстанову вышэйшай адукацыі (УВА) навучэнцаў, якія не заўсёды зарыентаваны на прафесію педагога. Выпускнікі школ не заўсёды дакладна вызначаюць сваю жыццёвую пазіцыю. У сувязі з гэтым да педагагічнай прафесіі, як і да ўсякай іншай, неабходна рыхтаваць маладых людзей дыферэнцыравана, з улікам інтарэсаў і схільнасцей асобы. Дакладней гаворачы, пры падрыхтоўцы спецыялістаў неабходна ўлічваць жыццёвую мэтанакіраванасць, гатоўнасць асобы да выбару і атрымання прафесіі.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры паняцце накіраванасці разглядаецца з розных пазіцый. Адны аўтары пад накіраванасцю асобы разумеюць лад, сістэму матываў (С. Л. Рубінштэйн, Л. І Батовіч), другія — дамініруючыя адносіны да свету, да людзей, да сябе (П. М. Якабсон), трэція — такія псіхалагічныя ўласцівасці, якія вызначаюць дзейнасць чалавека, агульную накіраванасць гэтай дзейнасці ў розных канкрэтных абставінах (В. С. Мерлін). Прафесійная накіраванасць знаходзіць сваё адлюстраванне ў інтарэсах, схільнасцях і імкненнях чалавека займацца пэўным відам працоўнай дзейнасці Гэта адна з вядучых характарыстык якасцей асобы педагога.

У прафесійнай моўнай падрыхтоўцы настаўнікаў пачатковых класаў узмацняецца ўвага выкладчыкаў вышэйшай школы да творчага выкарыстання патэнцыялу тэарэтычных і практычных моўных курсаў з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў. У практыцы навучання роднай мове ва УВА дакладна размяжоўваюцца лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі.

Так, у прыватнасці, лекцыя выкладчыка знаёміць студэнтаў з асновамі навуковай тэорыі, канцэптуальнымі падыходамі, вызначае кірунак, змест і характар усіх астатніх форм вучэбных заняткаў і самастойнай працы студэнтаў. І ўсё ж, на думку некаторых вучоных, у прыватнасці Т. А. Ільіной [1, с. 40], лекцыя — пасіўная форма навучання, бо ў перыяд лекцыі нялёгка вызначыць узровень актыўнасці разумовай дзейнасці студэнтаў. А эфектыўнасць навучальнага працэсу ўзрастае з павышэннем уласнай актыўнасці студэнтаў.

Актыўнай формай навучання з'яўляюцца семінарскія заняткі, мэта якіх — сінтэз апрацаванай студэнтамі інфармацыі, суаднясенне яе з матэрыяламі лекцыі, фарміраванне ў студэнтаў умення крытычна ацэньваць. Семінары заклікаcivil вучыць студэнтаў разважаць, спрачацца, думаць творча.

Аднак, не адмаўляючы ролі гэтых форм вучэбнай дзейнасці, мы разглядаем як важнейшае сувязное звяно паміж інфармацыяй, атрыманай на лекцыі, і асэнсаваннем спосабаў прымянення яе палажэнняў у моўнай і маўленчай дзейнасці менавіта практычныя заняткі. Для практычных заняткаў уласцівы свой узровень засваення матэрыялу. Узроўневы падыход дапамагае выкладчыку лепш іх падрыхтаваць: ставіць рэальныя мэты, аптымальна адбіраць змест, метады навучання.

© Гацко А. М., 2018



Репозиторий БарГУ

Практычныя заняткі ствараюць даволі спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі эфектыўнай зваротнай сувязі. Менавіта таму мэтазгодна вылучыць прынцып арганічнай узаемасувязі лекцыі і практычных заняткаў, які прадугледжвае рэалізацыю моўных тэарэтычных звестак ў практычным маўленні. Змест практычных заняткаў мае на мэце падрыхтаваць лінгваметадычную аснову для пераарыентацыі курса на патрэбы практыкі. Адбор, інтэграцыя і арганізацыя тэарэтычнага і практычнага дыдактычнага матэрыялу, метадаў і прыладаў працы пры арганізацыі практычных заняткаў вызначаюцца мэтамі і задачамі навучання мове ва УВА і школе. Аднак гэта не арыентуе на механічнае вывучэнне школьнага курса. Вядома, фундаментальныя палажэнні лінгвістыкі павінны канцэптуальна суадносіцца са школьнымі, бо прафесійная накіраванасць пранізвае ўсю навучальную працу па беларускай мове ў арганічным адзінстве як ва УВА, так і ў пачатковай школе.Уласныя назіранні, аналіз псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры даюць магчымасць зазначыць, што найбольш тыповым недахопам практычных заняткаў у педагагічнай навучальнай установе з'яўляецца іх недастатковая прафесійная накіраванасць. Перш-наперш праблема ў тым, каб дапамагчы студэнтам на практычных занятках не толькі знаходзіць патрэбныя з'явы і факты, расчляняць іх, вызначаць істотныя прыкметы, рабіць вывады, супастаўляць моўныя адзінкі па будове, значэнні і функцыі, але і навучыць будучых настаўнікаў успрымаць і складаць тэксты розных стыляў, тыпаў і жанраў, набываць навыкі карыстання мовай як педагагічным сродкам навучання і ўздзеяння на розум і сэрцы іншых людзей. У такіх умовах практычныя заняткі становяцца сродкам далучэння студэнтаў да будучай прафесійнай дзейнасці, «вытворчым цэхам», дзе ўдасканальваюцца і развіваюцца педагагічныя здольнасці і метадычнае майстэрства.

Асноўныя намаганні студэнтаў на практычных занятках накіроўваюцца на асэнсаванне сістэмы мовы. Моўныя з'явы часцей за ўсё засвойваюцца толькі ў аспекце формы і значэння. У ходзе падрыхтоўкі настаўніка пачатковых класаў варта лічыцца з тым, што настаўнік у сваёй прафесійнай дзейнасці мае справу і з функцыямі мовы, і з методыкай яе выкладання. Студэнты недастаткова знаёмяцца з прыёмамі, якія дапамагаюць успрымаць змест прачытанага, ствараць тэксты, характарызаваць мову суразмоўніка з боку яе гучнасці, захавання арфаэпічных, граматычных і стылістычных норм.

Як паказвае вопыт найбольш кваліфікаваных выкладчыкаў, актыўнасць самастойнай працы студэнтаў на практычных занятках на беларускай мове можна арганізаваць у наступных узаемазвязаных напрамках: змястоўна-пазнавальным, матывацыйна-мэтавым, метадычна-накіраваным, камунікатыўна-маўленчым, кантрольна-рэгуляцыйным.

У гэтай сувязі відавочна неабходнасць у тым, каб дапамагчы студэнту не толькі набыць веды па роднай мове, але і навучыцца прафесійна карыстацца словам, актыўна выкарыстоўваць яго ў ходзе маўленчай практыкі. Пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў выкладчыку даводзіцца, з аднаго боку, арыентавацца на студэнта, а з другога — арыентаваць студэнта на будучага вучня, на ўмовы, у якіх яму давядзецца працаваць, і на функцыі, якія прыйдзецца выконваць.

Практычныя заняткі аказваюць вялікі ўплыў на развіццё асобы студэнта. Выкладчык не заўсёды мае на ўвазе, што ён рыхтуе будучага настаўніка, а таму немэтазгодна захапляцца толькі адной лінгвістычнай навукай. Задача выкладчыка — адукоўваць студэнтаў, развіваць іх педагагічныя здольнасці і моўную культуру, фарміраваць як лінгвістычную, так і камунікатыўна-маўленчую, дыдактыка-метадычную і моўна-эстэтычную кампетэнцыі. У гэтых адносінах карыснымі будуць наступныя практыкаванні, змест якіх складалі прафесійна накіраваныя тэксты. Заданні да іх арыентаваны на асэнсаванне будовы тэксту і вызначэнне тэкстаўтваральнай ролі моўных адзінак:

1. Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім сінтаксічныя канструкцыі, якія ўскладняюць структуру простага сказа, выявіце іх ролю і асаблівасці ўжывання ў мове. Зрабіце сінтаксічны разбор двух сказаў.

2. Дайце загаловак тэксту, вызначце яго мэтанакіраванасць. Складзіце разважанне на тэму «Настаўніку ў пояс пакланюся, ён — гонар і надзея Беларусі», ужываючы ўскладняльнікі простых сказаў.

3. Пры вывучэнні тэм з раздзелу «Сінтаксіс» складзіце разважанні на агульна-чалавечыя і адначасова прафесійныя тэмы: «Якія справы чалавек павінен здзейсніць на Зямлі?»; «Мы ўсе абавязаны...»; «Каб стаць сапраўдным настаўнікам...»; « Я мару стаць...»; «Прафесія, якую я люблю...».

**Заключэнне.** Практычныя заняткі па беларускай мове варта лічыць неад'емнай часткай фарміравання актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнтаў, адной з асноўных арганізацыйных форм прафесійнага навучання. Менавіта на практычных занятках па роднай мове раскрываецца магчымасць найболыш поўнага ажыццяўлення прафесійнай накіраванасці навучання, фарміравання ў студэнтаў прафесійна значымых ведаў і ўменняў, якія спатрэбяцца ім у іх працоўнай дзейнасці.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Ильина, Т. А.* Проблемное обучение — понятие и содержание / Т. А. Ильина // Вестн. высш. шк. — 1996. — № 2. — С. 39—48.
2. *Парамзин, В. П.* Профессиональная направленность личности и её формирование в школьные годы / В. П. Парамзин. — Новосибирск, 2001. — С. 24.
3. *Протчанка, В. У.* Навучанне роднай мове. Сацыяльны і псіхолага-педагагічны аспекты / В. У. Протчанка, Л. А. Уздзенава // Нар. асвета. — 1991. — № 4. —С. 11—15.

УДК 378.1

**Н. И. Демидова**
Учреждение образования «Могилевский государственный университет продовольствия», Могилев

Репозиторий БарГУ

## ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЙ КВЕСТ В КУЛЬТУРНО-ИСТОРИЧЕСКОМ ПРОСТРАНСТВЕ

**Введение.** Окружающее учреждение высшего образования культурно-историческое пространство содержит в себе потенциальные возможности, которые при оптимальном использовании в рамках внеаудиторных воспитательных мероприятий могут стать условиями для развития социально-личностных компетенций будущих специалистов. Для реализации направления деятельности социально-гуманитарной кафедры — интеграция локальной среды профессионального воспитания в социальную — используются многоообразные ресурсы, которые каждый преподаватель может моделировать исходя из особенностей дисциплины, уровня готовности студентов. Одним из таких ресурсов являются разработанные квесты для активной работы студентов в культурно-историческом пространстве Могилева.

**Основная часть.** Площадкой для квеста выступило историко-культурное пространство Могилева, в котором расположено учреждение высшего образования. Элементы культурно-исторического пространства позволяют погрузиться в атмосферу изучаемой темы, а при использовании интерактивных форм обучения этот процесс происходит в активно-увлекательной деятельности студентов. Разработанный квест относится к реальной дневной игре, которая предполагает пешее передвижение по обозначенному маршруту с выполнением разнообразных заданий, чтобы студент мог взглянуть с иного ракурса на привычную городскую среду.

***Квест.*** Луполово — посад (предместье) Могилева, расположенный на восточном берегу Днепра. В настоящее время часть Октябрьского района города Могилева. С XV в. в исторических документах упоминается Заднепровский посад Могилева. На территории Заднепровского посада некогда находились Луполовская и Троицкая сотни. В конце XIX в. за этой частью Могилева закрепилось название — Московское предместье. Через эту часть города проходили торговые пути на юг и восток. Исходя из названия предместья, определите, какие изделия производили луполовские мастера.

***Ответ.*** Кожаные изделия, которыми славились луполовские мастера, вывозились в Польшу и Прибалтику. С одной стороны, в этом месте жили преимущественно кожевники, которые «лупили шкуру с животных», поэтому, скорее всего, позже место их проживания трансформировалось в название «Луполово». В конце XIX — начале XX вв. на территории Московского предместья находилось 30 кожевенных заводов.

Существует и другая версия. Луполово возникло недалеко от урочища Грабеж. Возможно, что название происходит от словосочетания «лупу брать» — собирать дань с проезжих купцов.

***Квест.*** С XVII в. известны улицы: Мстиславская, Чаусская, Черниговская, Ольховская, Луполовская, Гончарная, Алейная. О каких видах деятельности населения Луполова свидетельствуют эти названия?

***Ответ.*** Свидетельством развития ремесленничества.

***Квест.*** 8 сентября 1708 г. в ходе Северной войны (1700 — 1721) войско Петра I, после стоявшего около 2 месяцев войска шведского короля Карла XII, сожгло богатый торгово-купеческо-ремесленный город. Сгорела вся правобережная (вместе с центром) часть города. Деревянное Луполово уцелело. Что заблаговременно успели сделать жители Луполово, чтобы оно не сгорело?

© Демидова Н. И., 2018